ПАДЗЕЯ



# У ІМЯ БОГА І АЙЧЫНЫ

**НЯСВІЖ. 25 і 26 верасня на базе Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» адбыўся II Міжнародны праваслаўны фестываль духоўнай творчасці «Богородице похвалу воспоём». Другі год запар сярод удзельнікаў прадстаўнічага форуму – дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.**



У складзе дэлегацыі – старшыня ГрАА СПБ, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, паэтэса Людміла Кебіч; член СПБ, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь, літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць; лаўрэат Прэміі імя А. І Дубко і XXIII Міжнароднага Пушкінскага конкурсу, празаік, дзіцячая пісьменніца Ліна Багданава; паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык. Акрамя літаратараў Прынёмання, у Нясвіжскім праваслаўным фестывалі прыняла ўдзел дэлегацыя Мінскага гарадскога аддзялення СПБ на чале з паэтам, заслужаным дзеячам культуры Беларусі, лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай Прэміі Беларусі Міхасём Пазняковым. Да іх далучыліся прадстаўнікі творчай супольнасці розных пакаленняў з Міншчыны, Брэстчыны, Магілёўшчыны, іншых абласцей, літаратары з Ліпецка і Масквы. Сярод арганізатараў фестывалю – Беларуская Праваслаўная Царква, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Інстытут тэалогіі імя Святых Мяфодзія і Кірыла, БДУ, творчыя аб’яднанні і грамадскія арганізацыі Беларусі. Фестываль прысвечаны 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, 500-годдзю кнігі першадрукара Францыска Скарыны «Апостал» і прымеркаваны да цэлага шэрагу праваслаўных рэлігійных святаў (Дзень Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, Дзень Узвышэння Святога Крыжа).

Ідэйныя натхняльнікі гэтага маштабнага форуму – вікарый Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі, епіскап Нясвіжскі Аўксенцій і член Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўца, паэтэса, радыёвядучая Зоя Кулік. Сярод арганізатараў, членаў журы конкурса – аўтар сцэнарыя фестывальнай праграмы, наша калега па абласному аддзяленню СПБ, паэтэса Таццяна Яцук.

Паводле стваральнікаў свята, паняцце духоўнасці ўключае ў сябе некалькі вельмі важных сэнсаў. Гэта і хрысціянскі светапогляд, і любоў да бліжняга, павага да старэйшых, да традыцый, гісторыі і культуры роднага краю, інтэлектуальны і творчы патэнцыял, іх развіццё, удасканаленне, практычная рэалізацыя. У аснове канцэпцыі фестывалю – абарона традыцыйных каштоўнасцей, увасабленне духоўнага адзінства хрысціян, услаўленне ідэалаў гуманізму і патрыятызму ў мастацкай творчасці. Галоўнымі дзеячымі асобамі выступілі святары, педагогі і людзі мастацтва (паэты, барды, дэкламатары, мастакі). Пераможцы фестывальнага літаратурнага конкурсу (Гран-пры ў Людмілы Кебіч), удзельнікі і арганізатары свята атрымалі ў падарунак творы жывапісу ад членаў Еўразійскай мастацкай садружнасці (Мінск).

Як вядома, асновы духоўнасці закладваюцца на самым раннім этапе фарміравання асобы чалавека. Таму вельмі важная роля арганізатарамі была адведзена дзецям. Па спецыяльнай праграме ў рамках фестывалю адбыліся тэматычны конкурс юных чытальнікаў, цікавыя экскурсіі, тэатралізаваныя пастаноўкі, канцэрты, выставы, сустрэчы школьнікаў з сучаснымі пісьменнікамі, асветніцка-тэалагічныя гутаркі, прэзентацыі кніг. Пачаўся фестываль з круглага стала на тэму духоўнага выхавання, абароны хрысціянскіх і сямейных традыцый. У тэматычным пасяджэнні паўдзельнічала паэтэса з Гродна Вольга Алізар з сям'ёй. З дакладамі выступілі і госці з Гродна. Людміла Кебіч прапанавала агляд духоўнай тэматыкі ў формах працы і творчасці пісьменніцкай арганізацыі Прынёмання і ва ўласнай паэзіі. Вучоны, педагог, выкладчык ГрДУ імя Янкі Купалы Аліна Сабуць надала гутарцы за круглым сталом «купалаўскі вектар», запрасіла калег з іншых рэгіёнаў на традыцыйныя Купалаўскія чытанні, ахарактарызаваўшы шматгранны рэлігійна-духоўны аспект у традыцыях універсітэцкага жыцця. Гродзенская пісьменніца, педагог Галіна Богдан (псеўданім Ліна Багданава) падзялілася вопытам рэалізацыі праектаў духоўна-маральнай накіраванасці, адзначаных пераможнымі дыпломамі міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўню і паспяхова рэалізаваных у гродзенскай сярэдняй школе № 12 імя В. У. Бабко.



Да пасяджэння на тэмы духоўнасці далучылася паэтэса з Гродна Вольга Алізар з сям'ёй



Выступае Л. А. Кебіч





Выступае вучоны, педагог, выкладчык ГрДУ імя Янкі Купалы, член СПБ Аліна Сабуць



Выступае член СПБ Ліна Багданава (педагог Г. А. Богдан)




Зоя Кулік (крайняя з левага боку) і Уладыка Аўксенцій (крайні з правага боку)







На фестывальнай сцэне: Айцец Іаан, Таццяна Яцук, Дзмітрый Радзівончык, Зоя Кулік, Міхась Пазнякоў



Інтэр’ер Белай залы стварае непаўторную атмасферу і ўзнёслы настрой




Выступае Л. А. Кебіч



Выступае Аліна Сабуць




Выступае Дзмітрый Радзівончык



Вышэйшая ўзнагарода конкурснай праграмы фестывалю – у Людмілы Антонаўны

***

Усё часцей мы бачым, наколькі трывожны і супярэчлівы свет, у якім выпала жыць роду чалавечаму. Усё часцей нават самыя стойкія матэрыялісты вымушаныя спадзявацца на ласку вышэйшых нябесных сіл. Але, як кажуць, на Бога спадзявайся, а сам не адлыньвай. Чалавек жыве, пакуль у яго ёсць вера. Жыццё дэманструе неабходнасць яе мацаваць. ІІ Міжнародны праваслаўны фестываль духоўнай творчасці «Богородице похвалу воспоём» пацвердзіў актуальнасць па-хрысціянску боскага, творчага ладу жыцця, прадэманстраваў надзвычайную зацікаўленасць духоўнай тэматыкай сучаснага мастацтва, яе эфектыўнасць у справе пабудовы нашай светлай будучыні. Зразумела – калі ёсць запыт, трэба рухацца далей. Гэты накірунак неабходна развіваць і напаўняць яго новым карысным зместам. Магчыма гэта толькі сумеснымі намаганнямі ўлады, царквы, сістэмы адукацыі, культуры – гэта значыць, талакой, народнай еднасцю славян у імя Бога і Айчыны.

Скончыўся міжнародны творчы форум святкаваннем юбілея актыўнага грамадскага дзеяча, таленавітага літаратара, радзімазнаўцы, асветніцы і проста цудоўнай жанчыны Зоі Мікалаеўны Кулік. Віншуем!

Да пабачэння, фестываль! Да новых сустрэч, казачны Нясвіж!

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** ІІ Міжнародны праваслаўны фестываль духоўнай творчасці «Богородице похвалу воспоём» з удзелам літаратараў з Гродна. Мінская вобласць, г. Нясвіж, 25-26 верасня 2025 года.









У бібліятэцы Радзівілаў

уевроуернурн






Людміла Кебіч. Паэтэса ў інтэр’ерах Белай залы



Ліна Багданава: Нясвіж, ты проста космас!







Аліна Сабуць у Нясвіжы



Гродзенскія пісьменніцы з калегамі з іншых рэгіёнаў






На экскурсіі па Мірскім замку

Дмитрий Радиончик и Анатолий Аврутин




Ідэйныя натхняльнікі і арганізатары II Міжнароднага праваслаўнага фестывалю духоўнай творчасці «Богородице похвалу воспоём» Зоя Мікалаеўна Кулік і Уладыка Аўксенцій


«Богородице похвалу воспоём»

